УДК 394.268.3

# ЗВЫЧАІ І ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ. ДЗЯДЫ

**Самалазава Наталля Міхайлаўна,**
Сярэдняя школа № 1 г. Круглае (г. Круглае, Беларусь)

*У артыкуле разгледжаны традыцыі каляндарнай памінальнай абраднасці, прынятай на беларускіх землях. Ахарактарызаваны парадак рытуальных дзеянняў, выяўлены некаторыя іх рэгіянальныя адрозненні.*

Сёння ў нашым грамадстве стала папулярным адзначаць заходнія святы. Нікога ўжо не здівіш віншаваннем з Днём усіх закаханых. “Прыжыўся” на нашай тэрыторыі і запазычаны ў старажытных кельтаў Дзень усіх святых. Можа падацца, што тут няма нічога страшнага, але такім чынам мы пачынаем забываць, якія традыцыі існавалі ў нашай шматвяковай гісторыі, губляем частку сваёй духоўнай спадчыны. Каб гэтага не здарылася неабходна трымацца сваіх каранёў, таго што складае аснову нашага светапогляда. У першую чаргу гэта датычыцца звычаяў і абрадаў. Сярод іх асобае месца займаюць Дзяды – старажытны абрад памяці продкаў, які бярэ свой пачатак з язычніцкай традыцыі трызны, пазней адаптаванай хрысціянствам.

У славянскай міфалогіі, нябожчыкі не адыходзілі ў нябыт, а пераходзілі ў іншы стан існавання, адкуль маглі ўплываць на жыццё сваіх родзічаў. Згодна старажытных паданняў душы памерлых адлятаюць у Вырай. Расце ў Выраі сусветнае дрэва (па меркаванні продкаў – гэта дуб альбо бяроза), на якім і чакаюць душы новага нараджэння. Менавіта адсюль буслы прыносяць немаўлят, надзеленых сутнасцю людзей, якія жылі раней [2, с. 272]. Таму пад час Дзядоў нашчадкі мусілі ўспамінаць сваіх прашчураў і аддаваць ім належную павагу.

Сучасныя беларусы адзначаюць свята ад аднаго да шасці раз у год. У насельніцтва Падзвіння ў сувязі з гэтым нават існуе прыказка: “Каб сёмы Дзед, дык звёўся б і свет” [5, с. 135]. Тым самым падкрэсліваліся вялікія выдаткі на арганізацыю вячэры, якая была цэнтрам памінальнага абраду.

Лічылася, што тым хто дрэнна ўшаноўвае Дзядоў, яны помсцяць няшчасцем, хваробамі і стратамі ў гаспадарцы [6, с. 43]. Памятаючы пра гэта, нашы продкі да памянальнай вячэры рыхтаваліся загадзя і старанна. У хаце і на двары чыста прыбіраліся. Праваслаўныя напярэдадні Дзядоў бялілі печ. Калі была магчымасць, білі кабанчыка, рэзалі авечку ці цялё [4, с. 127]. Колькасць страў на стале вагалася ад 5-ці да 15-ці, але была заўжды няцотнай, што сімвалізавала семантыку свету нябожчыкаў. Але каб не пашкодзіць жывым, якіх ахоўвае сімволіка парнасці, кожную з гэтых страў выстаўлялі на стол на 2 талерках, такім чынам дагаджаючы і мёртвым, і жывым [5, с. 136]. Сярод прысмакаў былі варанае і смажанае мяса, бліны, клёцкі, кісель, гарох з макавым малаком, крупнік з грыбамі або рыбай, верашчака з каўбасой і інш. [1, с. 146]. Аднак, нягледзячы на такі багаты стол, у некаторых рэгіёнах Беларусі дазвалялася з’есці толькі тры стравы і выпіць тры чаркі.

На ўсходзе краіны часта на дзядоўскім стале была вараная свіная галава. Гэта напамін аб тым, што раней кожная значная падзея ў жыцці роду суправаджалася ахвярапрынашэннем татэмнай жывёлы [7].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ежу гатавалі зранку ў суботу. У паўночна-усходняй частцы краіны ў другой палове дня ўсе хатнія мыліся ў лазні і пакідалі крыху вады і венік для Дзядоў. І толькі тады ладзілі вячэру [6, с. 44]. Перад тым як сесці вячэраць, гаспадар тройчы абыходзіў са свечкай стол, у пакоі адчынялі вокны і дзверы і клікалі продкаў [1, с.146]. У розных месцах гэта рабілася па-свойму. Вядома, напрыклад, такое запрашэнне: "Святыя Дзяды, завём Вас, хадзіце да нас, ляціце да нас, чым толькі хата багата, што ёсць тут – я для Вас ахвяраваў! Прыхадзіце, дзяды-радзіцелі, і старыя, і малыя, хто на гэтай сялібе жываў, хлеба-солі ядаў!..." [3, с. 158].

Потым кожны, пачынаючы ад гаспадара ці старэйшага, зачэрпнуўшы першую лыжку старвы, выліваў яе на стол або ў асобную місу – для Дзядоў. Затым тое самае рабілі па чарзе ўсе астатнія. Або як варыянт, пасля кожнага зачэрпвання клалі лыжку на стол, каб яна паляжала. Лічылася, што ў прамежках ёй карыстаюцца продкі [4, с. 128].

У час вячэры гаварылі толькі пра продкаў, успаміналі іх учынкі. У некаторых населеных пунктах на змітраўскія Дзяды існаваў цікавы звычай запісваць членаў роду на покуці. На бэльцы выразалі імёны нованароджаных і памерлых за мінулы год [6, с. 159].

Пасля заканчэння вячэры гаспадар хлебнай скарынкай або блінам тушыў свечку. Існавала прыкмета: калі дым пойдзе ўверх – добра, а калі нахілена ў бок дзвярэй, то ў сям'і нехта памрэ. Затым прагаворваліся такія словы: "Святыя Дзяды, вы сюды прыляцелі, пілі, елі, ляціце ж цяпер да сябе!" [1, с. 146]. Яшчэ адзін абрад "развітання" з продкамі апісаў Мітрафан Доўнар-Запольскі: "Гаспадар або гаспадыня, набраўшы поўны кубак вады, паліваюць ад стала да дзвярэй і прыгаворваюць: "Што не даелі, не дапілі, то ідзіце на папер на двор" [4, с. 129].

На Палессі духаў выганялі іншым чынам: гаспад браў гаршок з рэшткамі куцці і, адступаючы задам да дзвярэй, казаў: "Дзяды, дзяды! Паелі куцці, - ідзіце дадому", пасля чаго ён адчыняў дзверы, кідаў гаршок на двор і хуценька прычыняў іх за сабой [6, с. 44].

Першым з-за стала ўставаў гаспадар або старэйшы член сям'і, так як яны першыя кандыдаты на далучэнне да свету Дзядоў. Калі ж гэта рабіў нехта іншы, яму пагражала смерць на працягу наступнага года [3]. Магчыма з гэтай традыцыі і бярэ пачатак знакамітая прыказка: "Не лезь паперад бацькі ў пекла!" .

Вялікай разнастайнасцю адрозніваліся звычаі абыходжання з рэшткамі памінальных страў. У большасці рэгіёнаў Беларусі раніцай наступнага дня гаспадары павінны былі паесці з дзедаўскай міскі. Гэтай стравай кармілі дзяцей, каб яны не палохаліся навальніцы. Або яе елі дарослыя, каб у іх не балелі зубы. Акрамя таго рэшткі ежы аддавалі жабракам ці дамашняй жывёле. Аб'едкі пакідалі птушкам [6, с. 45].

Паводле павер'я на Дзяды у жывых была магымасць паназіраць за светам продкаў. Для гэтага апоўначы трэба было сесці на падлогу або печ і глядзець праз хамут на дзверы. Але рабіць так старэйшыя не раілі, бо лічылася, што той, хто ўбачыць Дзядоў, хутка да іх далучыцца .

Як і ў іншыя памінальныя дні, на Дзяды забараняліся гаспадарчая заняткі. Асабліва гэта датычылася ткацтва: "На Дзяды не можна снаваці, бо Дзяды як ісці будуць у хату, то запутаюцца ў кроснах" [6, с. 45].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Неабходнасць захавання сваіх духоўных каштоўнасцей падкрэсліў яшчэ ў XIX ст. знакаміты беларуска-польскі паэт Адам Міцкевіч, які апісаў традыцыю шанавання Дзядоў у аднаіменнай паэме. Нажаль сёння разумеюць гэта далёка не ўсе. Бо Дзяды – гэта не толькі магчымасць паказаць продкам, што пра іх помняць, а іх учынкамі ганарацца. З другога боку – дзеці, успрымаючы інфармацыю аб сваіх сваяках, ведаюць на каго ім раўняцца. Так умацоўваецца пераемнасць ад пакалення к пакаленню, а народ не страчвае сваю самабытнасць.

## Літаратура


1. Беларуская міфалогія : Энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск. : Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Грушко, Е. А., Медведев, Ю. М. Русские легенды и предания / Е. А. Грушко, Ю. М. Медведев. – М. : Изд-во Эксмо, 2006. – 672 с. : ил.

3. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – Мінск. : Беларусь, 1998. – 190 с. : іл.

4. Навагродскі, Т.А. Асаблівасці памінальных трапез у традыцыйнай культуры беларусаў XIX – пачатку XX ст. / Т.А. Навагродскі // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 124–132.

5. Овсейчик, В. Особенности современной поминальной обрядности белорусов Подвинья / В. Овсейчик // Антропологический форум. – 2019. – № 41. – С. 123–144.

6. Славянские древности. Этнолингвистический словарь. В 5 томах. Том 2. Д – К (Крошки) / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Международные отношения, 1999. – 698 с.

7. Што калісьці елі на Дзяды? [Электронны рэсурс] // Звязда. – 2014. – 28 кастрычніка. – Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/sites/default/files/pdf/2014/10/28kas-6.indd_.pdf. – Дата доступу: 21.02.2020.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова